**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ**
**РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

вул. Калектарная, 10, 220004, г. Мінск
Тэл./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ**
**РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

ул. Коллекторная, 10, 220004, г. Минск
Тел./факс: 200-86-87, 200-97-55
E-mail: kanc@minjust.by, minjust@mailgov.by


23.06.2015 № 06-14/227

На № ____________________

Заснавальнікам Маладзёжнага грамадскага аб'яднання «Сучасны погляд» Ухналеву П.В., Суарэсу Ю.П., Траулька К.С. і інш.

Аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання

Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь разгледжаны дакументы аб дзяржаўнай рэгістрацыі Маладзёжнага грамадскага аб'яднання «Сучасны погляд» (далей – МГА «Сучасны погляд»).

Умовы стварэння і дзейнасці грамадскага аб'яднання, парадак дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання і разгляду дакументаў, прадстаўляемых для яго дзяржаўнай рэгістрацыі, устаноўлены артыкуламі 8, 13 і 14 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб грамадскіх аб'яднаннях» (далей - Закон).

Артыкулам 13 Закону ўстаноўлены спіс дакументаў, якія прадстаўляюцца для дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання ў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

Згодна з абзацам шостым часткі шостай артыкула 13 Закону для дзяржаўнай рэгістрацыі грамадскага аб'яднання ў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь прадстаўляецца спіс заснавальнікаў грамадскага аб'яднання, у якім вызначаны прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, дата нараджэння, грамадзянства, месца жыхарства і нумар дамашняга тэлефона, месца работы (навучання) і нумар рабочага тэлефона, а таксама змяшчаецца асабісты подпіс кожнага з заснавальнікаў.

Вывучэнне дакументаў, прадстаўленых для дзяржаўнай рэгістрацыі МГА «Сучасны погляд», паказала, што ў спісе заснавальнікаў МГА «Сучасны погляд» змешчаны не ўсе звесткі аб заснавальніках, якія ўстаноўлены ўказаным вышэй Законам.

Так, у спісе заснавальнікаў МГА «Сучасны погляд» адсутнічаюць нумары дамашніх тэлефонаў Баханка К.П., якая пражывае па адрасу: Муртазіна І.Н., які пражывае па адрасу: , Траулька К.С., якая

пражывае па адрасу: і .некаторых другіх заснавальнікаў МГА «Сучасны погляд».

Разам з тым, згодна з прадстаўленай Рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам электрасувязі «Белтэлекам» інфармацыі па ўказаным вышэй адрасам зарэгістраваны абаненскія нумары:

і др.

Пры правядзенні Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь выбарачнай праверкі звестак аб асобах, якія змешчаны ў спісе заснавальнікаў МГА «Сучасны погляд», устаноўлена, што заснавальнік дадзенага грамадскага аб'яднання ад Брэсцкай вобласці Басалай М.М. згодна вышэйназванага спіса зарэгістраваны па адрасу: , а на самай справе -

Азначанае вышэй сведчыць, што прадстаўлены ў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь спіс заснавальнікаў МГА «Сучасны погляд» утрымлівае няпоўныя і несапраўдныя звесткі аб заснавальніках, у сувязі з чым з'яўляецца несапраўдным дакументам.

На падставе выкладзенага, кіруючыся абзацам трэцім часткі трэцяй артыкула 14 і абзацам чацвертым часткі трэцяй артыкула 15 Закону, рашэннем Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь ад 19 чэрвеня 2015 года ў дзяржаўнай рэгістрацыі МГА «Сучасны погляд» адмоўлена.

Дадзенае рашэнне можа быць абскарджана ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь на працягу месяца з моманту яго атрымання.

Начальнік упраўлення па пытаннях
некамерцыйных арганізацый А.О.Кірычэнка

06 Курылік